*Ганна Сілівончык*

# ПРАБЛЕМА ДАСЛЕДАВАННЯ ТРАДЫЦЫЙНЫХ БЕЛАРУСКІХ ЦАЦАК

Традыцыйныя цацкі беларусаў з’яўляюцца да гэтага часу адной з маладаследаваных сфер народнай культуры. Дагэтуль амаль нічога не вядома аб сувязі цацак з пэўнымі перыядамі гадавога цыкла, або святамі, калі такая сувязь была, аб магчымых полавых і ўзроставых абмежаваннях. Вельмі сціплая інфармацыя аб саміх гульнявых сродках – іх знешнім выглядзе і параметрах, аб тым, хто, з чаго, у які момант рабіў той або іншы гульнявы інвентар і г.д.

Праблему ўяўляе таксама і тое, што найбольш цікавыя калекцыі беларускай цацкі захоўваюцца па-за межамі нашай краіны. Так, Гісторыка-этнаграфічны музей у Вільнюсе захоўвае прыклады беларускай драўлянай цацкі канца XIX – пачатку XX ст., Кракаўскі этнаграфічны музей у сваіх зборах мае беларускія саламяныя, гліняныя і драўляныя цацкі, сабраныя да 30-ых гадоў XX ст., Расійскі этнаграфічны музей утрымлівае калекцыю беларускіх цацак з дрэва, керамікі, тэкстылю і іншых матэрыялаў памерам каля 200 адзінак [1]. У зборах гэтага музея знаходзяцца цацкі, сабраныя падчас экспедыцый Е.Р. Раманава, А.К. Сержпутоўскага, А.А. Мілера і інш. [1] У музеях Беларусі захоўваюцца, у асноўным, археалагічныя знаходкі цацак, а таксама керамічныя цацкі другой паловы XX ст. [1].

Такім чынам, трэба адзначыць, што адзінкавыя вядомыя экзэмпляры некаторых відаў цацак не даюць поўнага ўяўлення аб гульнявым інвентары беларусаў, яго распаўсюджанасці на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Працы этнографаў канца XIX – першай паловы XX ст. утрымліваюць звычайна вельмі кароткія і непадрабязныя апісанні традыцыйнага гульнявога інвентару. Асаблівай увагі ў сувязі з гэтым заслугоўваюць працы М.Я. Нікіфароўскага [2] і Е.Р. Раманава [3], прысвечаныя дадзенай тэматыцы.

Тым не менш, недахоп этнаграфічнай інфармацыі з’яўляецца відавочным і, у сваю чаргу, стварае неабходнасць правядзення экспедыцыйных даследаванняў, збору дадатковых матэрыялаў, а таксама папаўнення існуючых калекцый традыцыйнай цацкі драўлянымі, тэкстыльнымі, ваўнянымі і іншымі прыкладамі, што ў сваю чаргу будзе садзейнічаць больш глыбокаму даследаванню традыцыйнай гульнявой сферы і магчымасці яе актуалізацыі ў сучаснай беларускай культуры.

Экспедыцыйнае даследаванне, праведзенае аўтарам у Дзятлаўскім і Шчучынскім раёнах Гарадзенскай вобласці ў 2012 годзе дазволіла зафіксаваць шэраг цікавых матэрыялаў і выявіць традыцыйны гульнявы інвентар, які быў распаўсюджаны на гэтых тэрыторыях.

У першую чаргу інфарматарамі ўзгадваюцца самаробныя скручаныя з тэкстылю лялькі і гульні з імі: «Лялькі рабілі. З трапак якую ляльку скруціў - і ігра. Яна - на адном акне, я - на другом. І свадзьбу зробім, і жаніха, і нявесту із гэдакіх куклаў. Наробім з лапікаў лялек» (Загдай Марыя Мацвееўна, 1924 г.н., в. Студзераўшчына, Дзятлаўскі раён, прав.).



*Малюнак 1* – Зінаіда Моцевіч з традыцыйнай лялькай, в. Прэціма



*Малюнак 2* – Марыя Ліпская з традыцыйнай лялькай, в. Прэціма



*Малюнак 3* – Алена Сціслевіч з традыцыйнай лялькай, в. Студзераўшчына

Акрамя тэкстыльных лялек, рабілі лялькі з саломы. «Лялькаў накруціш дзецям, якіх ты хочаш. Імёны давалі - Марыя, Каця, Вераніка - усякіх імёнаў давалі. Зробіш яшчэ і калысачку з кошыка, і мацяр'ялу паложыш, і калышаш. Пяску награбеш, ногу паставіш - печ зробіш, ды тады ўжо які лісточак - ужо булку пячэш, ляльку корміш, булку з жоўтага пясочку. <-*А ў якім узросце вы гулялі з лялькамі?*> Гулялі як гадоў 5, 6, 7 было. <-*А ці рабілі з саломы лялькі?*> Чаму ж не рабілі? Рабілі, абматаеш мацер'ялам, або хусткай - як снопік такі. <-*А рукі і ногі ў іх былі?*> Не, рук і ног не рабілі» (Ліпская Марыя Маісееўна, 1947 г.н., в. Прэціма, Шчучынскі раён, прав.) (мал. 2). «Ляльку да цыцкі тулілі – плача. І ў калыску клалі, паложаш ды качаеш. Салат з лістоў рабілі, кармілі» (Моцевіч Зінаіда Паўлаўна, 1942 г.н., в. Прэціма, Шчучынскі раён, прав.) (мал. 1). Пры гэтым лялькі маглі быць як маленькія, менш за далонь, так і больш вялікія, у 2-3 далоні вышынёй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Другі варыянт тэкстыльнай лялькі, які існаваў тут – шытая лялька. «Была жанчына, Аміля Бурдзеева, такія файныя лялькі шыла - то яна нам панашывае, то мы калысачкі паробім, гэтыя калысачкі калышам. І ручкі паробіць неяк, ну пальцаў не было, так, як далоньцы, і ножкі, намалёваныя вочы, губка, валасы з лёну доўгія, а калі коскі запляце» (Дашкевіч Таццяна Антонаўна, 1931 г.н., в. Прэціма Шчучынскі раён, прав.). Такія падрабязна зробленыя лялькі часта ўзгадваюцца падчас экспедыцыйных даследаванняў у розных рэгіёнах Беларусі, але ў сувязі з тым, што лялькі даўно выйшлі з ужытку, а працэс іх стварэння досыць крапатлівы, зафіксаваць у цяперашні час рэальныя артэфакты досыць складана.

Падчас палявога даследавання запісаныя расповяды і аб іншых цацках: ваўняных мячыках, бурчыках з косткі або гузіка, гульні ў вяровачку і інш. «Круцёлкі рабілі са шпулечкаў, у камушке йгралі" (Будзіловіч Марыя Іванаўна, 1947 г.н., в. Борці, Шчучынскі раён, прав.). «Конікаў рабілі на такіх палазэ, каб качацца *(вышыня прыкладна да калена - аўт.)*. Бурчык рабілі - трэба з нагі костку» (Будзіловіч Уладзімір Міхайлавіч, 1941 г.н., в. Борці, Шчучынскі раён, прав.). «У «кальцо» ігралі - з капейкай ці пугавіцай. Буркаўкі хлопцы рабілі з вельчэнькай косткі. А больша костачка - больш жужыць. У вяровачку гулялі - то там заложыш, то там - і палучаецца па рознаму» (Ліпская Марыя Маісееўна, 1947 г.н., в. Прэціма, Шчучынскі раён, прав.). «Мячыка каталі - у полі карову абдзіралі, як яна ліняе, і мачылі, і ўсё качалі гэдак во. І тады ігралі - кідалі адзін адному. <*-А якія яшчэ цацкі былі?*> Буркаўкі рабілі асобенна як свінячая ды нага, ну і з гузікаў рабілі. У вяровачку гулялі» (Моцевіч Зінаіда Паўлаўна, 1942 г.н., в. Прэціма, Шчучынскі раён, прав.). Ад гэтага інфарматара зафіксаваная гульня ў вяровачку, якая складаецца з 7 паслядоўных фігур. Нажаль, пакуль не вызначана распаўсюджанасць гэтай гульні на ўсёй тэрыторыі Беларусі, магчымая колькасць фігур і іх назвы, хто і калі ў яе гуляў. Гульня патрабуе дадатковага даследавання.

Негледзячы на тое, што як адзначаюць інфарматары, дзеці ў вясковым асяроддзі не мелі вялікага набору гульнявых сродкаў, а цацкі былі ў асноўным самаробнымі і досыць простымі, але іх было дастаткова: «Мячыкі рабілі - з палатна шылі, з каровы скатвалі. <*-А якія яшчэ цацкі былі?*> Костачка і вяровачкі - і тады ана бурчыць – «бурка». Рабілі з суставаў кароткіх, а тады дзірку прасверляць і за два канцы вяровачку працягаюць - і тады яна круціцца і гудзе. У любое врэмя рабілі: як кабана у вёсцы заколюць, тады кажны пацан робіць. Лодачкі з бумагі рабілі. <*-А конікаў можа рабілі, ваўчкі, лукі?*> Конікаў рабілі, і вазочкі рабілі, і ваўчкі, і лукі, хадулі рабілі - усё было раньшэ, усё рабілі, што ні хужай як цяперака" (Лагун Антон Канстанцінавіч, 1929 г.н., в. Студзераўшчына, Дзятлаўскі раён, прав.). Пры гэтым на першае месца выходзіў сам працэс стварэння цацкі і гульні з ёй, атрыманы досьвед, а не колькасць цацак, іх складанасць, альбо кошт. Амаль усе цацкі, наогул, рабіліся самастойна, а не набываліся. Такім чынам, гэта дазваляла дзецям правесці эксперымент, зразумець, як, з дапамогай якіх тэхнік і тэхналогій цацка зроблена, даследаваць уласцівасці матэрыяла, прыладаў і, урэшце, самога прыроднага і культурнага асяроддзя, у якім дзіцяці жыло.

Варта адзначыць, што падчас палявых даследаванняў інфарматары часта могуць не толькі распавесці пра цацку і гульню з ёй, але і што асабліва каштоўна - зрабіць саму цацку, у выніку чаго становяцца заўважнымі пэўныя дэталі, аб якіх не згадвалася ў аповядзе. Трэба прыняць да ўвагі, што часам пра пэўныя цацкі і гульні з імі вясковыя жыхары могуць не ўзгадаць, пакуль наўпрост не запытаеш, ці было такое, ці гулялі ў гэта. Вынікі правядзення нават невялікіх экспедыцыйных даследаванняў па дадзенай тэматыцы сведчаць аб тым, што негледзячы на тое, што ў сучасных вёсках традыцыйныя цацкі ўжо амаль не ўжываюцца, але да гэтага часу цалкам мэтазгодным і плённым з'яўляецца збор інфармацыі аб іх.

**Спіс літаратуры:**

1. Касцюкевіч, С.У. Семантыка і функцыі традыцыйных цацак беларусаў у XIX – XX стст. : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.07 / С.У. Касцюкевіч. – Мінск, 2004. – 199 л.
2. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. Т.4 : Игры и игроки / Н.Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – 1897. – № 3. – С. 21 – 66.
3. Романов, Е.Р. Игры и забавы белорусских детей / Е.Р. Романов // Белорусский сборник. – Вильна, 1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – С. 553–593.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ